4. *Шамякін, І. П.* Збор твораў : у 23 т. / І. П. Шамякін. — Мінск : Маст. літ., 2003—2015. — Т. 1 : Карэнні і галіны : з дзённікаў апошніх год ; Слаўся, Марыя!: гісторыя кахання, любові і жыцця ; Глыбокая плынь : раман ; прадм. А. Марціновіча. — 2003. — 446 с.
5. *Шамякін, І. П.* Збор твораў : у 23 т. / Іван Шамякін ; падрыхт. тэкстаў і камент. М. Мушынскага ; паслясл. М. Караткова ; Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т мовы і літ. імя Я. Коласа і Я. Купалы. — Мінск : Маст. літ., 2003—2015. — Т. 11 : Крыніцы : раман. — 2012. — 423 с.
6. *Шамякін, І. П.* Збор твораў : у 23 т. / І. П. Шамякін. — Мінск : Маст. літ., 2003—2015. — Т. 7 : Вялікая княгіня : раман ; Ах, Міхаліна, Міхаліна... ; Адна на падмостках ; Шлюбная ноч : аповесці. — 2006. — 398 с.
7. *Шамякін, І.* П. Збор твораў : у 6 т. / І. П. Шамякін. — Мінск : Маст. літ., 1977—1979.
8. *Шамякін, І. П.* Палеская мадонна : аповесці : для ст. школ. узросту / маст. М. Рыжы. — Мінск : Юнацтва, 1998. — 590 с.
9. *Шамякін, І. П.* Пошукі прытулку : аповесці : для ст. школ. узросту / І. П. Шамякін ; маст. У. М. Аніська. — Мінск : Юнацтва, 2001. — 350 с.
10. *Шамякін, І. П.* Трывожнае шчасце : пенталогія : для ст. школ. узросту / І. П. Шамякін ; маст. А. В. Александровіч. — Мінск : Аракул, 1995. — 608 с.

УДК 821.161.3-31*Я.Сіпакоў

**В. У. Гулькевіч**
*Установа адукацыі «Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Францыска Скарыны», Гомель*

# АДМЕТНАСЦЬ МАСТАЦКАГА СВЕТУ Ў АПОВЕСЦЯХ ЯНКІ СІПАКОВА

**Уводзіны.** Янка Сіпакоў — асоба ў айчынным мастацтве слова надзвычай шматгранная. Ён зарэкамендаваў сябе найперш выдатным паэтам. Зварот жа пісьменніка да эпічных жанраў абумоўлены сюжэтнасцю яго паэзіі. А яго проза ў сваю чаргу вызначаецца выключным лірызмам, паэтычным гучаннем. Духоўная і творчая эвалюцыя гэтага пісьменніка ўяўляе досыць цікавы феномен у сучаснай беларускай культуры, калі энцыклапедызм творчых памкненняў, скіраванасць на жывы і рухомы эстэтычны аб’ект, на адноснасць жанравых форм і абсалютнасць духоўнага зместу гавораць пра аўтара як унікальную творчую індывідуальнасць.

**Асноўная частка.** У абуджэнні асабістай цікавасці да прозы Я. Сіпакоў не бачыць нічога незвычайнага: «Гэта, мусіць, натуральна. Большую цікавасць, мне здаецца, выклікае іншы пераход — ад прозы да паэзіі. Паралельная праца ў паэзіі і прозе, на маю думку, заўсёды карысная — яна дапамагае ўзаемапранікненню жанраў: эпічнасць набывае паэзія, лірычнасць — проза» [1, с. 67]. Асабістае жаданне пісьменніка выпрабаваць свае сілы ў новых мастацкіх жанрах адлюстроўвае між тым заўсёды надзённую патрэбу літаратуры — наблізіцца да рэальных праблем сучаснасці, знайсці больш дасканалыя сродкі яе выяўлення. Слушна зазначае на гэты конт А. Гарлоўскі: «Усведамленне неабходнасці праўды, ісціны прымушае пісьменніка выбіраць не толькі тэмы, але і жанры — спосабы выяўлення ісціны, таму што на гэтым і толькі на гэтым літаратура трымаецца…» [2, с. 67]. І дадае: «Жанры падпарадкоўваюцца іншым, больш уладарным і больш глыбокім заканамернасцям, чым валявая арганізацыя літаратурнага працэсу, таму што яны з’яўляюцца адлюстраваннем не толькі глыбінных працэсаў жыцця, але і форм іх усведамлення, разумення сувязей, заканамернасцей жыцця» [2, с. 68]. Такім чынам, праца ў новым жанры непазбежна звязана з пераадоленнем цяжкасцей на шляху засваення іншых заканамернасцей мастацкай тыпізацыі.

Янка Сіпакоў увайшоў у мастацкую прозу аповесцямі «Крыло цішыні» і «Усе мы з хат», аб’яднанымі пасля з нарысам «Даверлівая зямля» ў адной кнізе. Гэтыя творы разглядаюцца крытыкамі ў рэчышчы лірычнай прозы: апавядальная плынь тут выразна суб’ектывізаваная (відавочна калі не тоеснасць, то блізкае падабенства асабістага лёсу галоўнага героя і лёсу аўтара).

Прынцып аўтабіяграфізму ўласцівы, хоць і ў рознай меры, і лірычнай прозе, і мемуарам, вызначае іх месца ў агульнай сферы дакументальнай літаратуры. Праецыруючы асабісты вопыт на агульнанароднае жыццё, аўтар вядзе тут размову «пра час і пра сябе». Яркасць і сіла яго ўражанняў з’яўляюцца зарукай праўдзівасці, фактычнай дакладнасці, доказнасці твора.

«Многім людзям, — гаворыць латышскі паэт Я. Асманіс, — спадарожнічаюць не толькі ўспаміны аб дзяцінстве, малюнкі і вобразы, настрой і роздум дзяцінства, але і адчуванні перажытых яркіх імгненняў. А гэта, на мой погляд, з’яўляецца перадумовай чалавечнасці, чуласці, здольнасці жыва і свежа ўспрымаць свет і адгукацца на яго з’явы, улавіць самае галоўнае і каштоўнае ў чалавеку — жывую душу» [3, с. 5].

Лірычная проза, несучы чытачу вялікі зарад душэўнай цеплыні, з’яўляецца актыўным сродкам сцвярджэння светлых гуманістычных ідэалаў. Сведчаннем таму ў беларускай прозе з’яўляюцца, напрыклад, творы Я. Брыля, У. Караткевіча, М. Стральцова.

Жанравая своеасаблівасць лірычнай прозы, блізкай да ліра-эпасу, дапамагла паэту Я. Сіпакову ў цэлым паспяхова пачаць працу на новым літаратурным мацерыку. У пісьменніка своеасаблівая лірычная проза. І хоць сюжэт у цэлым узгадняецца з логікай пачуццёвага, але ён абмяжоўваецца логікай жанру празаічнай адзінкі. Душэўнае не засланяе сабой падзейнага, а арганічна ўпісваецца ў яго ход, з’яўляючыся як бы каталізатарам самога дзеяння, яго творчым імпульсам.

Так, аповесць «Крыло цішыні» (1976) адлюстроўвае вясковае жыццё першых пасляваенных гадоў. Твор перадае спецыфічнасць гэтага пераходнага часу. Вайна закончылася, але яна яшчэ многае вызначае ў жыцці

© Гулькевіч В. У., 2017



Репозиторий БарГУ

людзей. Тут Я. Сіпакоў праз плынь успамінаў паштальёна ўздымае праблему вайны ў жыцці чалавека. Аўтар, улічваючы спецыфіку чалавечай псіхалогіі, якая адмаўляецца ўспрымаць жахлівае ў жыцці ва ўсёй яго паўнаце, паказвае страшную праўду пра вайну ў яе сапраўдным, крывава-пачварным абліччы, якая надзіва яскрава захавалася ў памяці беларусаў.

Пры пэўнай замкнёнасці, абмежаванасці дзеяння аповесць выяўляе істотнае, характэрнае ў вясковым побыце. Тут нямала дакладных дэталей, рэалій — сацыяльна-эканамічных, маральна-этычных, псіхалагічных. Справядлівую заўвагу да аповесці робіць Д. Санюк, сцвярджаючы, што «ўвесь твор прасякнуты псіхалогіяй і памяццю ваеннага і пасляваеннага часу, трэцяга года пасля вайны, калі над сцішанай і надзіва супакоенай зямлёй Сябрыні да болю ў вушах звінела нязвыклая цішыня» [4, с. 176]. Вобраз размытай цішыні, дарэчы, — фундаментальны і скразны сімвал ва ўсёй творчасці пісьменніка. Адсюль яго «ціхая лірыка» і «ціхая проза». Адсюль і невыпадковая назва аповесці «Крыло цішыні». Гэта сімвал-аналаг душэўнай мудрасці, супакоенасці і непарушнасці спрадвечнага болю, а часамі і роспачнага крыку ў абарону ўсяго добрага ў свеце» [5, с. 688].

Даследаванню ваеннага і пасляваеннага жыцця Я. Сіпакоў прысвяціў аповесць «Пыл пад нагамі» (1978), сюжэт якой цікава спалучаецца з лірычнымі адступленнямі. Гэты пласт у аповесці трэба прызнаць вызначальным як характэрную адзнаку творчасці пісьменніка, прыкмету яго надзвычай рамантычнай душы. Сіпакоў апавядае пра першыя дні вызвалення Беларусі, на шляхах і прасёлках якой толькі што ўзняўся, заклубіўся мірны пыл вяртання — да разбураных гнёздаў, руін, спустошаных палеткаў. Пыл, узняты натруджанымі нагамі адбітай у захопнікаў жывёлы і атрадам знямоджаных вайной яе ахоўнікаў — учарашніх салдат, партызан, бежанцаў — старых, жанчын, дзяцей…

Асэнсоўваючы праблему вайны і міру, аўтар, як і раней, зыходзіць з патрабаванняў надзённасці, абапіраючыся ў сваіх паказаннях сведкі і абвінаваўцы на факт, асабісты і ўсенародны вопыт. «Міру — мір!» — гэты заклік-вітанне гучыць у аповесці як не адасобленая яшчэ ад вайны кволая надзея, яшчэ не вельмі выяўленая знешне. Новы твор засведчыў агульны рост псіхалагічнай культуры Сіпакова-празаіка: больш трывалую сувязь характару і абставін, асабістага і агульнага ў працэсе мастацкай тыпізацыі, прыкметнае ўзбагачэнне аўтарскай выяўленчай палітры.

Такім чынам, у аповесці «Пыл пад нагамі» Я. Сіпакоў ад імя беларускага народа прад'явіў па ўсёй вартасці рахунак вайне і ўславіў мір, сцвярджаючы, што толькі згуртаваны, моцны духам народ мог перамагчы ў самай жорсткай у гісторыі чалавецтва вайне, трываць нягоды і цяжар пасляваеннай разрухі, узняць з руін фабрыкі і заводы, гарады і вёскі.

Аповесць «Жыві як хочацца» (1980) вырасла ўжо на новай, у параўнанні з папярэднімі творамі, глебе. Правамерная яе надзённая задума: на матэрыяле з гарадскога побыту, праз асабістыя дачыненні людзей паказаць пашырэнне спажывецкіх настрояў, мяшчанскай маралі, бездухоўнасці як з'яў чужародных, нясумяшчальных з этыкай гуманістычнага грамадства. Праз вобраз галоўнага героя аповесці Алега Жавейкі Я. Сіпакоў паказвае псіхалогію людзей, інтэлігентаў, якія ў час жыццёвых цяжкасцей страчваюць свой маральны воблік і становяцца на шлях дэградацыі. Адметнасцю твора з'яўляецца тое, што матыў індывідуальна-маральнай дэградацыі пераплятаецца з матывам маральнага падзення дзяржавы, віна якой бачыцца аўтару ў страце людзьмі духоўных і маральных каштоўнасцей.

Тэндэнцыя паглыбленага асэнсавання праблемы гуманізму знайшла сваё выяўленне ў аповесці «Усе мы з хат» (1982). У адрозненне ад «Крыла цішыні», прыкладу лірызаванага твора, што разам са сваімі плюсамі мае і мінусы (празмернае, неэканомнае выкарыстанне вобразнасці, асабліва ў пачатку твора), гэты твор сведчыць аб ураўнаважанасці суб'ектыўнага і аб'ектыўнага пачаткаў у апавядальнай плыні. Аповесць «Усе мы з хат» таксама напісана ад першай асобы, але «я» аўтара — тут проста выяўленчы прыём. Аўтар, бясспрэчна, жыве ў апавядальніку, але інакш, чым у аповесці «Крыло цішыні»: рух сюжэта вызначаецца тут і асабістымі дачыненнямі дзеючых асоб. Аповесць «Усе мы з хат» асвятляе жыццё беларускай вёскі, але не на трэцім годзе пасля вайны, а падчас напісання твора, у 1970-я гады. Па словах Д. Санюка, «у ідэйна-эстэтычным плане аповесць цікавая сцверджаннем прынцыпу “ўсе мы з хат” як асноўнага ў жыцці чалавека, які душой заўсёды будзе вяртацца да сваёй хаты, як да духоўнага апірышча, не толькі і столькі геаграфічна, колькі пачуццёва-духоўна» [5, с. 689].

Такім чынам, у аповесці «Усе мы з хат» пісьменнік паказвае жыццё вёскі ў мірны пасляваенны час, апісвае псіхалогію вясковых людзей, для якіх характэрна працавітасць, гаспадарчая самастойнасць, цвярозасць думак, розуму. Пры дапамозе пейзажных замалёвак Я. Сіпакоў услаўляе хараство беларускай прыроды, выказвае ідэю вернасці роднай зямлі, сваёй малой і вялікай бацькаўшчыне.

**Заключэнне.** Разгледжаныя аповесці Я. Сіпакова можна аднесці да «вясковай прозы». У творах, якія палягаюць (і па форме, і па змесце) у рэчышчы традыцыйнай прозы, выразна гучыць голас аўтара — сына вёскі, які імкнецца пры кожным зручным выпадку да сваіх вытокаў, каранёў, да прыгажосці непарушнага, спрадвечнага, гарманічнага, асвечанага векавымі традыцыямі народнага, бацькавага і матчынага жыцця. Таксама справядлівай будзе заўвага, што згаданыя творы пісьменніка належаць і да «ваеннай прозы». У іх Я. Сіпакоў скіраваў увагу на ваенны і пасляваенны стан беларускага грамадства, яго псіхалогію, светаадчуванне, стварыў вобразы герояў, праз паводзіны і ўчынкі якіх узняў важныя маральныя і этычныя праблемы.

Рэпазіторый БарДУ

**Спіс цытуемых крыніц**

1. *Лысенка, А.* Лінія гарызонта : Нарыс творчасці Янкі Сіпакова / А. Лысенка. — Мінск : Навука і тэхніка, 1986. — 119 с.
2. *Горловский, А.* Проза-1982 : По страницам литературно-художественных журналов / А. Горловский. — М. : Знание, 1983. — 64 с.
3. *Османис, Я.* Аистенок : поэма о детстве / Я. Османис. — М. : Знание, 1982. — 102 с.
4. *Сіпакоў, Я.* Крыло цішыні : кніга вёскі / Я. Сіпакоў. — Мінск : Маст. літ., 1976. — 471 с.
5. *Санюк, Д.* Янка Сіпакоў / Д. Санюк // Гісторыя беларускай літаратуры ХХ стагоддзя : у 4 т. / НАН Беларусі, аддз-не гуманітар. навук і мастацтваў, Ін-т літ. імя Я. Купалы ; пад навук. рэд. У. Гніламёдава, С. Лаўшук. — Мінск : Бел. навука, 2002. — Т. 4, кн. 1 : 1966—1985. — 928 с.

УДК 808.5

**С. В. Гуськова**
*Федеральное государственное бюджетное образовательное учреждение высшего образования «Тамбовский государственный университет имени Г. Р. Державина», Тамбов, Российская Федерация*

# КОНВЕРГЕНЦИЯ В МАСС-МЕДИА: ОСНОВНЫЕ ХАРАКТЕРИСТИКИ (НА ПРИМЕРЕ РАДИО «МАЯК»)

**Введение.** В современном мире сфера масс-медиа претерпевает существенные изменения, в частности, изменились способы презентации контента средств массовой информации (далее — СМИ) аудитории. «Превращение традиционных СМИ в мультимедийные СМИ на базе Интернета существенно изменило традиционные редакционные процессы. Если до этого интернет-редакция представляла собой обособленный внутри СМИ отдел, который занимался «переупаковкой» (точнее, простым размещением) традиционного контента в онлайновый контент, то с мультимедиатизацией содержания потребовалось глубокое проникновение принципов создания мультимедиа в сам редакционный процесс. Стало недостаточным просто сделать на радио репортаж, а затем отдать его в интернет-отдел для размещения. Потребовалось понять, что помимо этого репортажа его автор считает важным разместить в Интернете с учетом специфики интернет-аудитории и подготовить такие материалы. А это в свою очередь потребовало от журналистов новых обязанностей и новых компетенций.

Так постепенно появляются мультимедийные, или, как их называют, конвергентные редакции — редакции, в которых содержание по видам СМИ распределяется централизованно, в которых отдельные редакции конкретных видов СМИ не столь автономны, как в обычных холдинговых структурах» [1, с. 13—29]. Очевидно, что и в России, вслед за зарубежными странами, наметилась устойчивая тенденция конвергенции масс-медиа, которая имеет всепроникающий характер. В Интернете представлен контент печатных и электронных СМИ, аудитория становится его сотворцом, получая возможность обстоятельного комментирования сообщений журналистов, добавлять свои аудио- и видеозаписи в дополнение к информации, созданной журналистами. Изменения претерпевают не только формы создания медиаконтента, но и его содержание, язык и стиль подачи информации. В статье анализируются основные тенденции, характерные для конвергентных масс-медиа на примере радиоканала «Маяк».

**Основная часть.** Средства массовой информации все чаще представлены в Интернете либо имеют сетевой аналог печатных изданий; в Интернете транслируются теле- и радиопрограммы; часто сетевая версия печатного издания дополняется теле-/радиоконтентом. В этой связи уместно сказать о *мультимедийном* характере современных масс-медиа. Так, положительным примером может служить уже многолетний опыт газеты «Комсомольская правда», выходящей в печатном варианте и онлайн-версии, транслирующей в сети радио- и телепрограммы. Читатель, слушатель и зритель все активнее вовлекаются в процесс создания медиаконтента. Они имеют возможность сиюминутно комментировать сообщения журналиста, тем самым внося свою (подчас весомую) лепту в раскрытие темы. Кроме того, представители аудитории выкладывают в сеть в дополнение к журналистскому материалу фоторепортажи, видеоролики.

Поскольку контент создается и транслируется иными способами, чем в предшествующие периоды, актуально говорить о существенных изменениях его составляющих, в частности, лингвистической. Можно констатировать, что такие возможности, которые появились у аудитории СМИ, не всегда благоприятно сказываются на лингвистической составляющей медиасообщений. Медиа все больше характеризуются раскрепощенностью в языке и стиле, что наличествует не только в высказываниях журналистов, но и в высказываниях так называемых сотворцов журналистских сообщений — аудитории, которая активно включена в медийный процесс.

Материалом данного исследования является контент радио «Маяк» [5]. Представляется очевидным, что данное СМИ конвергентное по своим характеристикам. Рассмотрим контент масс-медиа более подробно.

На официальном сайте радио «Маяк» есть вкладки, сродни разделам в печатном издании, работающие как гиперссылки: «Домашнее задание», «Шоу», «Видео», «Подкасты», «Гости», «Архив / Программа передач», «Новости», «О нас». На главную страницу выносится тема, которая обсуждается в эфире. Есть две «кнопки» — «Слушать» (означает переключение на прямой эфир и возможность прослушать радиоконтент онлайн) и «Обсудить» (гиперссылка «Обсудить» отсылает на группу радио «Маяк» в социальной сети «ВКонтакте» [6]).

© Гуськова С. В., 2017

Репозиторий БарГУ